# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## 1.1.Характарыстыка вучэбнай дысцыпліны, яе мэты і задачы.

Спецкурс "Гісторыя беларускага кнігадрукавання" уяўляе сабой дысцыпліну па выбару, якая выкладаецца для студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, што навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 03 01 "Гісторыя (па накірунках)", накірунак спецыяльнасці 1-21 03 01-01 "Гісторыя (айчынная і ўсеагульная).

Спецкурс "Гісторыя беларускага кнігадрукавання" мае вялікае значэнне для сістэмнага спасціжэння студэнтамі гістарычных спецыяльнасцяў айчыннай гісторыі. Кнігавыдавецтва, асабліва ў XIX – XX стст., трэба разглядаць як сістэму, падсістэмамі якой з'яуляліся: кіраўніцтва кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў і ўстаноў, дзейнасць цэнзурных органаў, інстытуты па стварэнню, друку і распаўсюджванню літаратуры. У якасці мегасістэмы выступалі дзяржава і грамадства, якія стваралі эканамічныя і палітычныя ўмовы станаўлення, развіцця і функцыянавання кнігавыдавецкай сістэмы.

Спецкурс "Гісторыя беларускага кнігадрукавання" звязаны з такімі дысцыплінамі, як "Гісторыя Беларусі", "Гісторыя культуры", "Усеагульная гісторыя Новага і Навейшага часу". Міждысцыплінарныя сувязі двухбаковыя і носяць розны характар. У адных выпадках у межах спецкурса згадваюцца факты, вывучаныя ў межах іншай дысцыпліны, у другіх – інфармацыя тэарэтычнага характару, атрыманая пры вывучэнні сумежнага прадмета, напаўняецца канкрэтным сэнсам, у трэціх – адбываецца выкарыстанне і ўдасканальванне ўменняў, сфарміраваных пры вывучэнні іншай дысцыпліны і г.д.

Развіцё беларускага кнігадрукавання уяўляе сабой эвалюцыйны працэс. На кожным этапе развіцця меліся істотныя якасныя адрозненні. Перыядызацыя гісторыі беларускага кнігадрукавання грунтуецца на наступных палажэннях: 1 – вылучэнне перыядаў знаходжання Беларусі ў складзе ВкЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, а таксама ўздзеяння на культурнае жыццё вызначальных дзяржаўных палітычных уціскаў у перыяд СССР, атрыманне незалежнасці; 2 - у аснову перыядызацыі пакладзены: ступень удзелу дзяржавы ў працэсе кнігадрукавання, змены ў асноўных структурных элементах кнігавыдавецкай сістэмы: кадравае забеспячэнне, матэрыяльна-тэхнічная база, функцыі, тэматыка і змест кнігавыдавецкай прадукцыі.

Вучэбная праграма спецкурса "Гісторыя беларускага кнігадрукавання" складзена ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі:

- Адукацыйны стандарт па спецыяльнасці 1-21 03 01 "Гісторыя (па накірунках)", (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 12.06.2008);
- Парадак распрацоўкі, зацвярджэння і рэгістрацыі вучэбных праграм для першай ступені вышэйшай адукацыі (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 12.11. 2008 г.).

**Мэта** выкладання і вывучэння дысцыпліны: вывучэнне гісторыі беларускага кнігадрукавання ў яе гістарычным развіцці і на сучасным этапе.

**Задачы** выкладання і вывучэння дысцыпліны:

- характарыстыка гістарычных перыядаў і этапаў развіцця беларускага кнігадрукавання;
- выяўленне асаблівасцей эвалюцыі беларускага кнігадрукавання на кожным этапе развіцця;
- раскрыццё ўяўленняў аб развіцці разнастайных тыпаў і відаў друкаванай кнігі, яе тэматыкі, мовы, мастацкага афармлення;
- авалоданне ведамі аб буйнейшых цэнтрах беларускага кнігадрукавання, дзеячах, помніках кніжнай культуры.

*У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны*

**ведаць:**

- асноўныя этапы кнігадрукавання;
- ролю і месца кнігі ў развіцці чалавечага грамадства;
- сістэму кніжнай справы ў яе гістарычным развіцці;
- буйнейшыя цэнтры кнігадрукавання;
- спосабы вытворчасці кнігі, яе матэрыяльныя формы, тыпы і віды;
- найбольш значныя помнікі кніжнай культуры;
- знакамітых кнігавыдаўцоў.

**умець:**

- карыстацца асноўнымі паняццямі, тэрмінамі кнігадрукавання;
- выкарыстоўваць веды па гісторыі беларускага кнігадрукавання ў далейшай прафесійнай падрыхтоўцы;
- улічваць гістарычныя ўмовы пры разглядзе важнейшых падзей і ролі асобы ў развіцці кнігі;
- валодаць асноўнымі фактамі і вынікамі вывучэння гісторыі беларускага кнігадрукавання.

У працэсе навучання ў студэнтаў павінна забяспечвацца фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

1) *акадэмічныя кампетэнцыі*:

- валоданне базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі і выкарыстанне іх для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
- валоданне даследчымі навыкамі;
- уменне працаваць самастойна;
- валоданне міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні прафесійных задач.

2) *сацыяльна-асабістыя кампетэнцыі*:

- здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- здольнасць да міжасабовых камунікацый;
- умець фарміраваць уласнае меркаванне;
- навык працы ў калектыве.

3) *прафесійныя кампетэнцыі*:

- выкарыстоўваць неабходныя метады даследавання зыходзячы з патрэб канкрэтнай сітуацыі;

- валоданне метадамі сістэмнага і параўнаўчага аналізу; сфарміраванасць крытычнага мыслення;
- уменне аналізаваць матэрыял і бачыць яго гістарычнае значэнне;
- мець навыкі самастойнай працы з першакрыніцамі і навуковай літаратурай;
- дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт погляду, аналізаваць факты.
- фармуляваць і вырашаць задачы, узнікшыя ў працэсе навукова-даследчай і вучэбнай дзейнасці;
- рыхтаваць даклады, рэфераты, аналітычныя матэрыялы.

### 1.2. Метады і тэхналогіі навучання.

Сярод эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць засваенню студэнтамі ведаў, іх уключэнню ў пошук інфармацыі і кіраванне ёю, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, патрэбна вылучыць:

- тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
- праектныя тэхналогіі,
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыя, мазгавы штурм, вучэбныя дэбаты),
- гульнявыя тэхналогіі, у рамках якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных і іншых гульнях.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці могуць быць выкарыстаны рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ВНУ у практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўключаць методыкі актыўнага навучання і дыскусійныя формы.

### 1.3. Структура і змест курса

У адпаведнасці з базавым вучэбным планам спецыяльнасці на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца 43 гадзіны, з якіх 34 гадзіны складаюць аудыторныя заняткі (18 гадзін лекцыі, 16 гадзін семінарскія).

## II. ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго аўдыторных | З іх | |
| | | | лекцыі | семінары |
| 1. | Уводзіны. | 1 | 1 | - |
| 2. | Узнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання ў эпоху Адраджэння. Дзейнасць Францыска Скарыны. | 7 | 3 | 4 |
| 3. | Развіццё кнігадрукавання на беларускіх землях у складзе Рэчы Паспалітай. | 8 | 4 | 4 |
| 4. | Кнігадрукаванне на беларускіх землях у межах Расійскай імперыі. | 10 | 6 | 4 |
| 5. | Беларускае кнігавыдавецтва ў эпоху Навейшага часу. | 8 | 4 | 4 |
| | Усяго | 34 | 18 | 16 |

## ІІІ. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСУ

**Уводзіны.**

Мэты і задачы дысцыпліны па выбару “Гісторыя беларускага кнігадрукавання”. Сувязь з іншымі агульнанавуковымі, агульнапрафесійнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі. Значэнне дысцыпліны ў агульнанавуковай і прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў. Аб’ём і структура. Асноўныя формы аўдыторных заняткаў, кантролю.

Перыядызацыя беларускага кнігадрукавання. Праблемы тэрміналогіі. Асноўныя этапы вывучэння гісторыі беларускага кнігадрукавання ў беларускай гістарыяграфіі. Сучасныя распрацоўкі замежных аўтараў.

**Узнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання ў эпоху Адраджэння. Дзейнасць Францыска Скарыны.**

Перадгісторыя кнігадрукавання. Выкарыстанне ксілаграфіі ў Антычнасці. Кітайскае кнігадрукаванне. Першыя друкаваныя кнігі Японіі.

Сацыяльна-эканамічныя і культурныя перадумовы ўзнікнення кнігадрукавання ў Заходняй Еўропе. Дзейнасць Іагана Гутэнберга і яго паслядоўнікаў. Першыя друкаваныя кнігі ў Англіі. Дзейнасць універсітэцкіх друкарняў. Умовы развіцця кнігавыдання ў Італіі. З’яўленне антыквы. Дзейнасць выдавецкай фірмы Альдаў. “Друкарня справы Кангрэгацыі прапаганды веры”. Кнігавыданне ў Нідэрландах (Лаўрэнса Янсзон Костэр). Друкарня Крыстофера Плантэна. Амстэрдам як еўрапейскі цэнтр гандлю і друку. Дзейнасць Эльзевіраў. Распаўсюджванне пратэстантызму ў Францыі. Выдаўцы-гуманісты Эцьены, Эцьен Дале. Кампанія “Вялікі карабель”. Узнікненне дзяржаўных тыпаграфскіх прадпрыемстваў. Цэнзура друкаваных кніг. З’яўленне першых газет.

Першыя друкаваныя кнігі Усходняй Еўропы. Тэматыка, тыпы, мова кніжных выданняў. Выдавецкая дзейнасць Швайпольта Фіёля.

З’яўленне кнігадрукавання ў Маскоўскай дзяржаве. Ананімныя выданні. Арганізацыя “Друкарскага двара”. Выдавецкая дзейнасць Івана Федарава і Пятра Мсціслаўца і іх паслядоўнікаў.

Інкунабулы і палеатыпы. Асаблівасці мастацтва кнігі.

Рукапісная спадчына ВкЛ. Кітабы. Эпоха Адраджэння. Ідэі гуманізму. Фактары, якія садзейнічалі з’яўленню і распаўсюджанню беларускага кнігадрукавання. Кніжны рэпертуар. М. Гусоўскі “Песня пра зубра”. Кнігадрукарская дзейнасць Францыска Скарыны. Пражскі і віленскі перыяды. Мова выданняў. Асаблівасці зместу і афармлення кніг. Культурна-гістарычнае значэнне дзейнасці Францыска Скарыны.

Паслядоўнікі Францыска Скарыны і развіццё прыватнага кнігавыдання. Распаўсюджанне рэфармацыйнага руху. Росквіт палемічнай літаратуры. Фундатары друкарняў. Брэсцкія друкарні. Бернард Ваявудка. “Спосабы і звычаі”. Анжэй Тшэцкі. Ян Малецкі Станіслаў Мурмэліс. Мікалай Радзівіл Чорны. “Індэкс забароненых кніг”. Радзівілаўская Біблія. Цыпрыян Базылік. Дзейнасць Сымона Буднага. “Катэхізіс”, “Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам”, “Евангелле” Васіля Цяпінскага. Дзейнасць Заблудаўскай друкарні.

**Развіццё кнігадрукавання на беларускіх землях у складзе Рэчы Паспалітай.**

Люблінская (1569) і Брэсцкай (1596) уніі, іх уплыў на змены ў кнігадрукаванні. Узнікненне друкарняў каталіцкіх ордэнаў.

Брацкае кнігадрукавання. Спірыдон Собаль. Лаўрэнцій Зізаній. “Граматыка Славянская”. Любчанская друкарня.

Адраджэнне кірілічнага кнігадрукавання ў Вільні. Друкары Мамонічы. Выданне кніг, неабходных для справаводства і судоў. Трэці статут ВкЛ. Развіццё кніжнай вытворчасці. Панегірыкі выленскіх “акадэмікаў” А. Крэўскага і А. Раецкага. Эра медзыярыту ў кніжнай ілюстрацыі. Мастацтва кнігі перыяду першых Вазаў.

Езуіты. Першая друкарня лацінская шрыфту ў Вільні. Мікалай Кшыштаф Радзівіл Сіротка. Ліквідацыя пратэстанскіх друкарань. Друкарні пры каталіцкіх касцёлах. Забарона ўжывання беларускай мовы ў ВкЛ.

Магілёўская богаяўленская друкарня – апошняя брацкая друкарня на Беларусі. Максім Вашчанка. Тэматыка кніг Магілёўскай друкарні. Аздабленне выданняў. Тэхніка дрэварыту. Гравёр Фёдар Ангілейка. Ілюстрацыйны матэрыял выданняў.

Уніяцкая кірылічнае кнігадрукаванне. Супрасельская друкарня. Афармленне кніг. Супрасельскія графікі. Тэматыка выданняў. Палемічныя творы. Кнігі для набажэнства. Мастацкая літаратура. Навукова-папулярныя працы. Вучэбныя дапаможнікі.

Слуцкая друкарня (1660). Тэматыка выданняў. Свецкі характар прадукцыі слуцкай друкарні. Ілюстрацыі. Тыражы кніг.

Актывізацыя кнігавыдавецкай дзейнасці ў другой палове XVIII ст. Выкарыстанне разнастайных шрыфтоў. “Каралеўская друкарня” (1775-1802). Антон Тызенгаўз. Ян Ясінскі. Выраб “масавай прадукцыі”. Пераклады французскай літаратуры. Жан Эмануэль Жылібер. “Флора Літвы”. Кнігі для стараведаў.

Першыя перыядычныя выданні. “Газета Гродзенская”. Мінская друкарня (1790). Магілёўская прыдворная друкарня. Станіслаў Богуш-Сестранцевіч. Нясвіжская друкарня Радзівілаў. Полацкая езуіцкая друкарня (1787). Слонімская друкарня (1774- 1782).

Друкарская дзейнасць ураджэнцаў Беларусі ў Расіі. Сімеон Полацкі.

**Кнігадрукаванне на беларускіх землях ў складзе Расійскай імперыі.**

Развіццё кнігадрукавання Беларусі ў першай палове XIX ст. Рэформа друку і кнігавыдавецкай справы. Скасаванне ўказа ад 1796 г. аб закрыцці вольных (прыватных) друкарняў Аляксандрам І. Указ 1802 г. аб вызваленні літаратуры ад нагляду ўпраў дабрачыннасці. Перадача функцый цэнзуры Галоўнаму кіраўніцтву вучылішчаў. Першы цэнзурны статут 1804 г. Цэнтралізацыя цэнзуры. Цэнзурны камітэт Віленскай навучкальнай акругі ў Вільні. Стварэнне асобага цэнзурнага камітэта пры Міністэрстве паліцыі. Кнігавыдавецкая палітыка Мікалая І. Цэнзурныя статуты аб цэнзуры  1826 г., 1828 г. “Змрочнае сямігоддзе”.

Стварэнне новых друкарань у першай трэці XIX ст. Дзейнасць яўрэйскіх друкарань. Казённыя, царкоўныя, прыватныя друкарні. Дзейнасць друкарні Я. Ясінскага. Стан паліграфічнай базы. Кнігавыдавецкая дзейнасць прыватных выдавецтваў у першай трэці XIX ст. Польскамоўныя кнігі. Паліграфічныя прадпрыемствы новага тыпу. Друкарня З. Нахімовіча ў Гродне. Кнігадрукарская дзейнасць З.Прэса (1818-1835) і І. Стэфановіча (1817-1848) у Мінску. Выдавецкая дзейнасць царкоўных друкарняў. Друкарня Полацкай езуіцкай акадэміі. “Месячнік Полоцкі”. Выдавецкая дзейнасць піяраў. Губернскія друкарні. Спецыфіка матэрыяльнай базы і кадравага складу. Кнігавыдавецкая дзейнасць губернскай друкарні ў Мінску. Тэматыка кнігавыдавецкай прадукцыі Віцебскай і Гродзенскай губернскіх друкарань.

Спад актыўнасці друкарняў і выдавецтваў у  другой трэці XIX ст. Зацвярджэнне ў кнігавыданні капіталістычнага спосаба вытворчасці. Памяншэнне колькасці прыватны друкарняў. Умацаванне матэрыяльнай базы казённых друкарань.Выпуск афіцыйных газет – губернскія ведамасці (з 1838 г.). Змены ў моўнай структуры выдавецкай прадукцыі. Перавага свецкай літаратуры над рэлігійнымі выданнямі. Навуковая літаратура. Сельскагаспадарчыя публікацыі. Раздзяленне выдавецкіх, друкарскіх і кнігагандлевых функцый (сярэдзіна XIX ст.).

Дзейнасць группы выдаўцоў уласных твораў (В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, С.Манюшка і інш.). Дыспрапорцыя паміж попытам на літаратуру і магчамасцямі на мясцовых друкарняў. Практыка сумеснага выдання кніг. Віленскія друарні. Арганізацыя кніжнага гандлю.

“Часовыя правілы аб друку” (6 красавіка 1865 г.). “Бесполезность” друкавання кніг на беаларускай “гаворцы”. Асобныя цыркуляры генерал-губернатара Мураўёва і Каўфмана. Увядзенне ўнутранай і знешняй цэнзуры.

Удасканаленне паліграфічнай базы друкарань. Далейшае развіцце тэндэнцыі раздзялення выдавецкіх і друкарскіх функцый. Тэматычная разнастайнасць кніжнай прадукцыі.Дзейнасць прыватных друкарань. Друкарня Ё.Дворца, Б.Саламанава,. І. Тасьмана, Г. Малкіна, М. Нэймана  і інш.

Сістэматычны харакатар кнігавыдння губернскіх друкарань. Краязнаўчы характар выдавецкай прадукцыі Віцебскай губернскай друкарні.

Пашырэнне тэматычных межаў выдавецкай прадукцыі ў другой палове XIX ст. Выдавецкай дзейнасць губернскіх статыстычных камітэтаў. Памятныя кніжкі губерняў. Агляды губерняў. Гісторыка-статыстычнае апісанне гарадоў. Выдавецкая дзейнасць А.П. Сапунова. “Витебская старина”. Працы А.М. Семянтоўскага. Кнігі А.П. Смародскага. Выпуск даследаванняў І.Д. Гарбачэўскага. Е.Ф. Арлоўскага, М. Доўнар-Запольскага, М.Я. Нікіфароўскага. А.Я. Багдановіча, Е.Р. Раманава. Публікацыя помнікаў старажытнасці. Уздым выдання сельскагаспадарчай, медыцынскай літаратуры ў 90-я гг. XIX ст. Замежныя беларускамоўныя выданні. Кастусь Каліноўскі і “Мужыцкая праўда”. Рост перыядычных выданняў у другой палове XIX ст. «Минский листок». “Гоман”.

Уздым кнігадрукавання на Беларусі ў пачатку XX ст. Павелічэнне аб’ема выдавецкай прадукцыі. Актыўнасць губернскі друкарань. Руска-, польска-, беларуска-, літоўскамоўны друк. Спецыялізацыя прыватных друкарань.Віцебская друкарня Г. і П. Падземскіх. Друкарскія прадпрыемствы Я. Падземскага, Ш. Фрыдланда, І. Клаза. Дзейнасць павятовых друкарань. Уплыў на кнігавыдавецкую дзебйнасць Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. В.С. Арсеньев. С.П. Сахараў. Выдавецкая дзейнасць беларускаг этнографа Е.Р. Раманава. Пашырэнне кола арганізацый і ўстаноў, якія займаліся выдавецкай дзейнасцю. Тэматычная разнастайнасць выдавецкай прадукцыі. Выпуск даведачнай літаратуры. Выпуск падручнікаў. Павелічэнне колькасці твораў мастацкай літаратуры. Выданне кніг царкоўнымі брацтвамі, епархіяльнымі саветамі, вучылішчамі.

Першае беларускае выдавецкае таварыства “Круг беларускі, або Гурток беларускае народнае прасветы” (1902). Тэматыка выданняў. Уплыў рэвалюцыі 1905-1907 гг. на кнігавыдавецкую справу. Беларускі друк. Тыраж выданняў. Выдавецкая суполка “Загляне сонца і ў наша аконца” (май 1906). Браніслаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла. Друкаванне і распаўсюджанне беларускай літаратуры. “Беларускі лемантар, або Першая навука чытання” (1906). “Першае чытанне для дзетак беларусаў”. “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”. Выпуск беларускіх паштовак з краявідамі Беларусі, партрэтамі беларускіх пісьменнікаў, гістарычнымі малюнкамі. Выданне серыі “Беларускія песняры”. Роль суполкі “Загляне сонца і ў наша аконца” ў папулярызацыі беларускай кнігі. Выдавецтва А. Грыневіча ў Пецярбургу (1910). “Наша ніва”. “Наша хата”. “Палачанін”. Ажыўленне беларускага кнігадрукавання. Друкарня М. Кухты. Кніжнае таварыства “Мінчук” (1906). “Беларускае выдавецкае таварыства” ў Вільні (1913). Віленскае выдавецтва “Беларус”. Седьскагаспадарчы часопіс на беларускай мове “Саха”. Літаратурна-навуковы часопіс “Лучынка”. Спроба выдання дзіцячых кніг.

Пашырэнне прыватнага выдавецкага прадпрымальніцтва. Прыватныя грамадска-літаратурныя газеты. Кніжныя крамы. Нелегальны друк.

**Беларускае кнігавыдавецтва ў эпоху Навейшага часу**

Змены ў кніжнай справе Беларусі пасля 1917 г. Хаатычная выдавецкая дзейнасць. Дэкрэт аб друку. Партыйны друк. Выдавецтва БНР. Кніжная прадукцыя часоў нямецкай і польскай акупацыі. Віцебскае і Гомельскае аддзяленні Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР на тэрыторыі Беларусі. Дэфіцыт кніг на беларускай мове. Беларускае аддзяленне Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР. Беларускае аддзяленне Дзяржвыдавецтва ў Берліне. Зміцер Жылуновіч. С. Некрашэвіч. Я. Лёсік. Уплыў новай эканамічнай палітыкі на выдавецкую справу ў БССР. Кааператыўныя выдавецтвы. “Адраджэнне”. Белтрэстдрук. Беларускамоўныя выдавецтвы за мяжой.

Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў. Змест рэдакцыйна-выдавецкіх планаў. Цэнзурныя абмежаванні. Пазіцыя кіруючых органаў на кожным этапе развіцця. Спецыфіка матэрыяльнай базы і кадравага складу. Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай справе ў БССР у 1920-я гг. Аддзел друку ЦК КП(б)Б.

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Уплыў беларусізацыі на кнігавыдавецтва. Тэматычная і моўная разнастайнасць кнігавыдавецкай прадукцыі. Тыражы.

Стварэнне цэнтралізаванай кнігавыдавецкай сістэмы ў 1930-я гг. Перавага дзяржаўных планаў над рэальным попытам. Павелічэнне дэнацыялізаваных “сацыяльна

важных” выданняў.  Новы сацыяльны статус кнігі. Павелічэнне аб’ёма кнігавыдавецкай прадукцыі.

Кнігавыдавецтва ў Заходняй Беларусі ў 1920-30-я гг. Структура і асаблівасці кніжнай справы. Прыватныя выдавецтвы. Тэматыка і мова выданняў.

Уключэнне Заходняй Беларусі ў новую палітычную сістэму і сацыяльную рэчатснасць у 1939 г. Ліквідацыя непрымальнай з пункту ідэалагічных пазіцый літаратуры і замена новай адпаведнага зместу. Лёс паліграфічных прадпрыемстваў Заходняй Беларусі. Дзейнасць ваенных і цывільных цэнзурных органаў. Недахоп падручнікаў. Дастаўка літаратуры з Масквы, Мінску. “Актуальная” літаратура.

Выдавецкая дзейнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыйны, падпольны, тылавы друк.

Узнаўленне выдавецкай справы ў пасляваенны перыяд. Стварэнне новых выдавецтваў. “Беларускі дом друку”. “Народная асвета”. “Ураджай”. “Вышэйшая школа”. “Юнацтва”. “Навука і тэхніка”. “Мастацкая літаратура”. “Полымя”. “Універсітэцкае”. Мастацкае афармленне. Тэматыка выданняў. Тыражы кніжнай прадукцыі. Першая універсальная 12-томная “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя”. 7-томны “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”. 100-томная серыя “Скарбы сусветнай літаратуры”. “Беларускі кнігазбор”. Конкурс “Мастацтва кнігі”. Самвыдат.

Кнігадрукаванне беларускай пасляваеннай эміграцыяй.

Беларуская кнігавыданне ў 1990-я гг. Ліквідацыя ідэалагічных і цэнзурных абмежаванняў.Перавыданне нацыянальнай кніжнай спадчыны. Недзяржаўныя кнігавыдавецтвы. Выдавецкі цэнтр “Бацькаўшчына”. ISBN 985-000-000-0. Нацыянальная кніжная палата. Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па друку.

## IV. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## ЛІТАРАТУРА


1. Агіевіч У.У. Сімволіка гравюры Скарыны.-Мн.: Бел. Навука,1999.- 320с.
2. Агіевіч У.У. Скарынаў прафесіонім "доктар Францыск" //Скарына і наш час: Матэрыялы II міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 16-17 мая 2002 г.): У 2-х частках. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф.Скарыны», 2002. – Ч. 1. – С. 174-182.
3. Александровіч С.Х. Пуцявіны роднага слова: Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX ст. – Мінск. 1971.
4. Алексеев А.А. "Песнь песней" в Острожской Библии: Состав и источники текста //Федоровские чтения. 1981 /Отв. ред. Е.Л.Немировский. – М.: Наука, 1985. – С. 116-124.
5. Алексеев П.А. Рассмотрение славянской старопечатной книги Апостола, которая справлена доктором Франциском Скориною из Полоцка, напечатанная в Вильне в 1525 году в четверть листа //Опыт трудов Вольного российского собрания при имп. Московском университете. – М., 1783. – Ч. УІ. – С. 203.
6. Андрэявец Рыгор. Жыццё Францыска Скарыны. – Гомель: РПУП "Полеспечать", 2004. – 76 с.
7. Аниченко В.В. Недописанная страница скоринианы //Франциск Скорина и Вильнюс: Сборник материалов республиканской научной конференции, посвященной 500-летию со дня рождения Франциска Скорины /Составитель Л.В.Судавичене. – Вильнюс, 1991. – С. 6-11.
8. Анічэнка У.В. Ваенная тэрміналогія і яе вытокі ў скарынаўскіх старадруках //Беларуская мова. – Гомель: ІВЦ ГДУ імя Ф.Скарыны, 1999. – Вып. 24. – С. 3-12.
9. Анічэнка У.В. Значэнне кірыла-мяфодзіеўскай дзейнасці для справы Скарыны //Чырвоная змена. – 1990. – 26 мая.
10. Анічэнка У.В. Назвы жывёльнага свету ў выданняў Скарыны //Беларуская мова. – Мінск: БДУ, 1990. – Вып. 18. – С.3-9.
11. Анічэнка У.В. Скарынаўскія традыцыі ў Маскве //Беларусіка /Пад рэд. А.Мальдзіса. – Мінск, 1993. – Кн. 1. – С. 256-260.
12. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я. Купалы ; падрыхт. А.І. Богдан і інш. ; навук. рэд. А.А. Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн. : Беларуская навука, 2005. – 1015 с.
13. Анушкин А. Во славном месте Виленском: Очерки по истории книгопечатания. – М.: Искусство, 1962. – 172 с.
14. Анушкин А.И. Книгопечатание в Литве ХУІ-ХУІІ вв. //400 лет русского книгопечатания. Русское книгопечатание до 1917 г. – М.: Наука, 1964. – С. 111-118.
15. Анушкин А. На заре книгопечатания в Литве. Вильнюс, 1970.
16. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. давед. Мн., 2001.

17. Ахрыменка П.П., Ларчанка М.Р. Старажытная беларуская літаратура. – Мінск: Вышэйшая школа, 1968. – 173 с.
18. Баршчэўская Н. Імя і прозвішча беларускага першадрукара і мова яго выданняў у асвятленні часопісу “Запісы” //Скарына і наш час: Матэрыялы II міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 16-17 мая 2002 г.): У 2-х частках. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф.Скарыны», 2002. – Ч. 2. – С. 15-25.
19. Баршчэўскі А. Францішак Скарына і Рэнесанс //480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў /Гал. рэд. А.Мальдзіс. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – С. 26-32.
20. Баренбаум И.Е. История книги : [уч. для фак. ин–тов культуры] / И.Е. Баренбаум, Т.Е. Давыдова. – М. : Книга, 1971. – 463 с. Рэжым доступу: http://www.hi-edu.ru/e-books/xbook032/01/index.html?part-002.htm.
21. Баренбаум И. Е. К вопросу об универсальном понятии “книга” / И.Е. Баренбаум // Книга: Исслед. и материалы. – М.: Книга, 1977. – Сб. 34. – С. 5– 13.
22. Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. артыкулаў : у 2 ч. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Т. А. Дзем’яновіч, Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. – Мн., 2006. – Ч. 1. – 242 с. ; Ч. 2. – 209 с.
23. Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе: Асобныя выданні: Бібліяграфія /Склад. Зора й Вітаўт Кіпелі. – Нью Ёрк, Менск, 2003. – 582 с.
24. Ботвинник М.Б. Изучение жизни и деятельности Франциска Скорины в БССР //Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве /Редколлегия: Е.С.Лихтенштейн, А.И.Маркушевич, Е.Л.Немировский (зам. председателя), Т.А.Подмазова, А.А.Сидоров (председатель), Н.М.Сикорский, Н.Н.Соловьева. – М.: Наука, 1979. – С. 124-135.
25. Ботвинник М.Б. Откуда есть пошел букварь. Минск, 1983.
26. Брага Сымон. Доктар Скарына ў Маскве: патент или другой охранный документ / С. Брага. - Мінск: Навука і тэхніка, 1993. - 47 с.
27. Бровкин Е.А. Солунские братья и Франциск Скорина: традиции христианского просвещения //Скарына і наш час: Матэрыялы II міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 16-17 мая 2002 г.): У 2-х частках. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф.Скарыны», 2002. – Ч. 1. – С. 3-5.
28. Бярозкіна Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XV – пачатак XX ст.) : вуч. дап. для студ. гіст. і бібл. спецыяльнасцей ВНУ / Н.Ю. Бярозкіна. – 2-е выд. – Мн. : Беларуская навука, 2000.
29. Великий белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве //Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве /Редколлегия: Е.С.Лихтенштейн, А.И.Маркушевич, Е.Л.Немировский (зам. председателя), Т.А.Подмазова, А.А.Сидоров (председатель), Н.М.Сикорский, Н.Н.Соловьева. – М.: Наука, 1979. – С. 5-23.

30. Владимиров Л.И. Издания и переводы Библии в идеологической борьбе в Великом княжестве Литовском //Федоровские чтения. 1981 /Отв. ред. Е.Л.Немировский. – М.: Наука, 1985. – С. 34-48.
31. Владимиров Л.И. Всеобщая история книги: Древний мир. Средневековье. Возрождение. XVII век. – М. : Книга, 1988.
32. Воінаў М.М., Усовіч К.С. Францыск Скарына як настаўнік люду паспалітага //Адукацыя і выхаванне. – 1995. - № 8. – С. 39-42.
33. 400-лецце беларускага друку. 1525-1925. – Мінск, 1926.
34. 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.
35. 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў /Гал. рэд. А.Мальдзіс і інш. - Мінск: Беларуская навука, 1998. - 272 с.
36. Галенчанка Г.Я. Кнігадрукаванне // Гісторыя Беларускай ССР у пяці тамах. *Т. І.* Мн.: Навука і тэхніка, *1972*. С. 271-276.
37. Галенчанка Г.Я. Васіль Цяпінскі - паслядоўнік скарынінскай справы // 450 год беларускага друкавання. Мн.: Навука і тэхніка, 1968. С. 171-178.
38. Галенчанка Г.Я. Фрацыск Скарына – беларускі і усходнеславянскі першадрукар. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993.-280с.
39. Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст. / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. – Мн. : Вышэйшая школа, 1998. – 560 с.
40. Голенченко Г.Я. Симон Будный. Книгоиздательская деятельность в Белоруссии // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1970. С. 168-193.
41. Горфункель А.Х. Историко-культурное значение первопечатных Библий (Острожская Библия в контексте европейской культуры) //Федоровские чтения. 1981 /Отв. ред. Е.Л.Немировский. – М.: Наука, 1985. – С. 66-76.
42. Гравюры Францыска Скарыны/Складанне і тэскт Л.Ц.Баразны, 2-е выд.- Мн.:"Беларусь",1990.-192с.
43. Грицкевич А. П. Книжное дело в феодальном Слуцке в XVI – XVIII вв.// Вопросы библиографоведения и библиотековедения. Минск. 1983. Вып. 4. С. 52-61.
44. Губіна Т.В. Нацыянальнае і агульначалавечае ў эстэтычнай сістэме Ф.Скарыны і І. Мележа //Скарына і наш час: Матэрыялы ІІІ міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 7 кастрычніка 2004 г.). – Гомель: УА «ГДУ імя Ф.Скарыны», 2004. – С. 112-120.
45. Гячкаускас Г. Франциск Скорина – секретарь вильнюсского епископа Иоанна из князей литовских //Федоровские чтения. 1982 /Отв. ред. Е.Л.Немировский. – М.: Наука, 1987. – С. 60-67.
46. Докторъ Франциск Скорина. Его переводы, печатныя изданія и языкъ. Изследование П.В.Владимирова. – СПб, 1888.
47. Доўнар Л. І. Выдавецкая справа / Л.І. Доўнар // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мн. : БелЭн, 2004. – Т. 18, кн. 2 : Рэспубліка Беларусь. – С. 428–436; Довнар Л.И. Издательское дело / Довнар Л.И. // Республика Беларусь : энциклопедия [в 6 т.]. – Мн. : БелЭН, 2005. – Т. 1. – С. 877–885; Таксама: Издательское дело / Довнар Л.И. // Республика Беларусь : энциклопедия [в 6 т.]. – Мн. : БелЭн, 2006. – Т. 3. С. 719–723.

48. Журавский А. 450 лет белорусского книгопечатания / А.И. Журавский, А.Н. Булыко // Книга. Исследования и материалы. – М., 1967. – Сб. 14. – С. 104–120.
49. Зелянкова А.І., Старавойтаў М.І. Ф.Скарына і яго час у гісторыі і культуры Беларусі 20-х гг. XX ст. //Скарына і наш час: Матэрыялы II міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 16-17 мая 2002 г.): У 2-х частках. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф.Скарыны», 2002. – Ч. 1. – С. 25-31.
50. Зернова А.С., Горбунов Т.С. Книгопечатание в Белоруссии ХУІ-ХУІІ вв. //400 лет русского книгопечатания. Русское книгопечатание до 1917 г. – М.: Наука, 1964. – С. 99-110.
51. Исаевич, Я. Д. Роль братств в издании и распространении книг на Украине и Белоруссии (конец XVI – XVIII вв) / Я.Д. Исаевич // Книга и графика. – М., 1972. – С. 132.
52. Каўка А.К. Што чытаў Скарына? // История книги, книжного дела и библиографии в Белоруссии (сборник статей). Мн.: Цнб им. Я.Коласа АН СССР, 1986. – 189с.
53. Клышка, А. К. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга : для малодш. і сярэдн. шк. узросту / А. К. Клышка. - Мінск : Полымя, 2000. - 96 с.
54. Кириллические издания старообрядческих типографий конца XVIII– начала XIX века: каталог / ЛГУ. Научная б-ка им. М. Горького; сост. А.В. Вознесенский. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1991. – № 9; с. 21.
55. *Кніга Беларусі. 1517-1917*: зводны каталог [Электронны рэсурс] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі, НДІ кнігазнаўства. Навук. кіраўнік праекта Л. Г. Кірухіна; Склад. каталога Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч. - Электронныя тэкставыя, графічныя даныя і праграма (196 Мбат). - Мн.: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2005. - 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM); 12 см.
56. Кодер Дональд. Мой Франциск Скорина: эссе / Д. Кодер; пер. А. Новиков, Г. Ермаков ; исл. В. Конон ; ред. В. Конон. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. - 71с.
57. Конан У.М. Рэлігійныя погляды Скарыны //Скарына і наш час: Матэрыялы І-й рэспубліканскай навуковай канферэнцыі. – Гомель: ГДУ імя Ф.Скарыны, 1994. – С. 37-39.
58. Ластоўскі В. Гісторыя беларускай кнігі. Коўна. 1926
59. Либрович С. Ф. История книги в России: Со снимками с древних рукописей, образцами первопечатных книг и позднейших редких изданий, портретами, копиями картин, гравюр и пр., и пр. / С. Ф. Либрович. – М., 2004. – 238 с.
60. Луппов С. П. Книга в России в первой четверти XVIII века / С. П. Луппов. – Л. 1973. – 374 с.
61. Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII—XVIII стст.). Мінск, 1980.
62. Матэрыялы Першых Кнігазнаўчых чытанняў [Мінск, верасень 1998 г.] / склад. Т.І. Рошчына. – Мн., 2000.
63. Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навукова-практ. канф. (Мінск, 3–4 кастр. 1996 г.) /

рэдкал. : А. Трусаў, Т. Самайлюк, Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч, А. Патупа, Я. Будзінас, Н. Бярозкіна. – Мн. : Тэхналогія, 1997. – 70 с.
64. Немировский Е.Л. Начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. Жизнь и деятельность Франциска Скорины: Описание изданий и указатель литературы. – М.: Государственная библиотека СССР им. В.И.Ленина. Отдел редких книг, 1978.
65. Немировский Е.Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя. – Мн.: Маст. Літ.,1990.-597с.
66. Нясвіжскія зборы Радзівілаў: іх фарміраванне, гістарычны лёс, цяперашняе месцазнаходжанне і шляхі выкарыстання / Рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) і інш. - Мн.: «Беларускі фонд культуры», 2002. - 368 с.
67. Палкаўнічэнка Мікалай, Усовіч Канстанцін. Сімволіка на партрэце Скарыны //Кантакты і дыялогі. – 1998. – " 9 (верасень). – С. 3-6.
68. Паўлавец Дзмітрый. З падстрэшша рук Скарынавых…Развіццё традыцый беларускага першадрукара яго паслядоўнікамі ў XУІ-XУІІ стст. //Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. - № 5. – С. 74-76.
69. Пічэта У. Друк на Беларусі ў XVI  і XVII ст.// 400-лецце беларускага друку. Мінск, 1926. С. 228-261.
70. Прашковіч М.І. Францішак Скарына – беларускі першадрукар. Пад рэдакцыяй д. г. н. З.Ю. Капысскага. – Мн.: Народная асвета, 1970. – 96с.
71. Рарытэты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі = Rarities of the National library of Belarus : фотаальбом / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; [складальнікі: Г.У. Кірэева і інш.; навуковы кіраўнік Л.Г. Кірухіна; перакладчык ТАА "Гільдыя прафесійных перакладчыкаў"; фота А.В. Шчукін]. – Мінск: НББ, 2005. – 63 с. : каляр. іл.
72. Самайлюк Т. Тыпалагічная характарыстыка каталіцкай кнігі, выдадзенай у Вялікім Княстве Літоўскім у XVIII ст. / Т. Самайлюк // Гісторыя выдавецкай дзейнасці ў Польшчы і Беларусі ў XVI – XX стагоддзях : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, ЦНБ імя Я.Коласа. – Мн. : Белфранс, 2003. – С. 57–70.
73. Самойлюк Т.А. Православная книга в Беларуси / Т.А. Самойлюк. – Мн. : Православ. Братство в честь Святого Архистратига Михаила, 2005. – 128 с.
74. Самойлюк, Т. А. Белорусская книга в контексте мировой книжной культуры / Т. А. Самойлюк // Книжное дело. – 2006. – № 2. – С. 102–104. – Таксама як электронны рэсурс. Рэжым доступу: http://knigdelo.ru/default.asp?id=7&news_id=584.
75. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Уступ. арт., падрыхт. тэкстаў, камент., слоўнік А.Ф.Коршунава, паказальнікі А.Ф.Коршунава, В.А.Чамярыцкага. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.
76. Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства: Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый" (Мінск, 21-25 мая, 4-7 снежня 2000 г.) /Рэдкал.: У.Конан (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 364 с.

77. Скарына і наш час: Матэрыялы II міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 16-17 мая 2002 г.): У 2-х частках. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф.Скарыны», 2002.
78. Словарь книжников и книжности Древней Руси / Институт русской литературы АН СССР. Вып. 2: вторая половина XIV–XVI в. – Ленинград: Наука, 1989.
79. Слоўнік мовы Скарыны: У 3-х тамах /Складальнік У.В.Анічэнка. – Мінск: Вышэйшая школа, 1977, 1984. – Т. 1: А-О. – 476 с.; – Т. 2: П-Я. – 362 с.
80. Усовіч К. Роля Магдэбурскага права ў жыцці і дзейнасці Ф.Скарыны //Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: Зборнік навуковых прац. – Наваполацк: Полацкі дзяржаўны універсітэт, 2001. – С. 47-52.
81. Франциск Скорина – белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. – Минск: Вышэйшая школа, 1989.
82. Франциск Скорина и Вильнюс: Сборник материалов республиканской научной конференции, посвященной 500-летию со дня рождения Франциска Скорины /Составитель Л.В.Судавичене. – Вильнюс, 1991.
83. Шицгал А. В. Создание и эволюция русского гражданского шрифта / А. В. Шицгал // 400 лет русского книгопечатания 1564 – 1964 / Сост. И. И. Сахаров. – 1964. – С. 150-156.
84. Шомракова И.А. Всеобщая история книги / И.А. Шомракова, И.Е. Баренбаум ; СПбГУКИ. – СПб. : Профессия, 2005.
85. *Kultura książki ziem wschodniego i południowego pogranicza Polski (XVI-XX wiek): Paralele i różnice*. Red. naukowa J. Gwioździk i E. Różycki. Katowice, 2004.
86. Topolska M.B. Czytelnik i ksiazka w Wielkim Ksiestwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. Ossolineum, 1984.
87. Turonek Jerzy. Książka Białoruska w II Rzeczy Pospolitej. *1921–1939*. – Warszawa: Slawistyczny Ośrodek Wydawniczy (Prace Slawistyczne; 109), 2000. – 79 s.

Прыкладныя пытанні да заліку па дысцыпліне "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ"

1. Асноўныя этапы вывучэння гісторыі беларускага кнігадрукавання ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі.
2. Перыядызацыя беларускага кнігадрукавання. Праблемы тэрміналогіі.
3. Сацыяльна-эканамічныя і культурныя перадумовы ўзнікнення кнігадрукавання ў Заходняй Еўропе.
4. Вынаходніцтва Іагана Гутэнберга і яго паслядоўнікаў.
5. Першыя друкаваныя кнігі Усходняй Еўропы. Тэматыка, тыпы, мова кніжных выданняў.
6. Цэнзура друкаваных кніг. "Індэкс забароненых кніг".
7. Інкунабулы і палеатыпы. Асаблівасці мастацтва першых друкаваных кніг.
8. З'яўленне і распаўсюджанне беларускага кнігадрукавання. Кніжны рэпертуар.
9. Кнігадрукарская дзейнасць Францыска Скарыны. Пражскі і віленскі перыяды.
10. Асаблівасці зместу і афармлення кніг Францыска Скарыны.
11. Выдавецкая дзейнасць Івана Федарава і Пятра Мсціслаўца і іх паслядоўнікаў.
12. Рэфармацыйнае кнігадрукаванне.
13. Дзейнасць Сымона Буднага.
14. Дзейнасць Васіля Цяпінскага.
15. Дзейнасць Брэсцкай друкарні (1553-70-я гг.).
16. Дзейнасць Заблудаўскай друкарні (60-я гг.16 ст).
17. Віленская друкарня Мамонічаў.
18. Брацкае кнігадрукаванне.
19. Кнігавыдавецкая дзейнасць ордэна езуітаў.
20. Любчынская друкарня (17 ст).
21. Дзейнасць Магілёўскай богаяўленскай друкарні (канец 17 ст).
22. Уніяцкае кірылічнае кнігадрукаванне.
23. Слуцкая друкарня (1660г.).
24. Кнігавыдавецкая дзейнасць у 18 ст.
25. "Каралеўская друкарня" (1775-1802).
26. Дзейнасць Сімяона Полацкага.
27. Цензурная палітыка царскага урада на Беларусі ў першай трэці 19 ст.
28. Развіццё кнігадрукавання на беларускіх землях у першай трэці 19 ст.
29. Развіццё кнігадрукавання на беларускіх землях у другой трэці 19 ст.
30. Дзяржаўная палітыка царскага урада ў кнігавыдавецтве ў другой палове 19 ст.
31. Тэматычная разнастайнасць кніжнай прадукцыі ў другой палове 19 ст.
32. Выдавецкая дзейнасць губернскіх статыстычных камітэтаў.
33. Выдавецкая дзейнасць А.П. Сапунова.
34. Уздым кнігадрукавання на Беларусі ў пачатку 20 ст.
35. Спецыялізацыя прыватных друкарань.
36. Выдавецкая дзейнасць Е.Р Раманава.
37. "Круг беларускі, або гурток беларускае народнае прасветы" (1902).
38. Выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша ваконца".
39. Віленскія выдавецтвы "Наша Ніва", "Наша хата", "Палачанін", "Беларускае выдавецкае таварыства".
40. Мінскія выдавецтвы – "Мінчук", "Саха", "Лучынка", "Вольная Беларусь".
41. Асаблівасці развіцця беларускамоўнага друку ў пачатку XX ст.
42. Змены ў кніжнай справе Беларусі пасля 1917 г.
43. Выдавецтва БНР.
44. Віцебскае, Гомельскае Беларускае аддзяленні Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР.
45. Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай справе ў БССР у 1920-я гг.
46. Тэматычная і моўная разнастайнасць кнігавыдавецкай прадукцыі ў 1920-я гг.
47. Стварэнне цэнтралізаванай кнігавыдавецкай сістэмы БССР у 1930-я гг.

48. Структура і асаблівасці кніжнай справы ў Заходняй Беларусі ў 1920-30-я гг. Тэматыка і мова выданняў.
49. Выдавецкая дзейнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны.
50. Кнігадрукаванне беларускай пасляваеннай эміграцыяй. Тэматыка выданняў.
51. Кнігавыдавецтва БССР у 70-80-я гг. Тэматыка выданняў.
52. Беларускае кнігавыданне ў 1990-я гг.